**«Удасканаленне ўменняў і навыкаў
арфаграфічнай граматнасці вучняў IX-XI класаў па беларускай мове праз выкарыстанне эфектыўных метадаў і прыёмаў навучання»**

**А. П. Хрышчановіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

Мова – памяць народа, яго неацэннае духоўнае багацце. Рускі педагог, заснавальнік навуковай педагогікі ў Расіі Канстанцін Дзмітрыевіч Ушынскі пісаў: «Увесь уклад свайго духоўнага жыцця народ беражліва захоўвае ў народным слове. Мова ёсць самая жывая, самая багатая і трывалая сувязь, якая злучае мінулыя, сучасныя і будучыя пакаленні народа ў адно вялікае гістарычна-жывое цэлае» [4, с. 12].

Беларуская мова прайшла вялікі і складаны шлях. Аднак двухмоўная сітуацыя ў нашай краіне склалася на сённяшні дзень не на карысць беларускай мовы. Пераважная большасць людзей выкарыстоўвае рускую мову. Для большасці вучняў нашай краіны мовай, якую яны чуюць упершыню, з’яўляецца руская. Сапраўднае беларускамоўнае асяроддзе для іх звычайна адсутнічае. Родная мова не з’яўляецца мовай дзіцячага мыслення. Навучэнцы рускамоўных школ сутыкаюцца са значнымі цяжкасцямі пры вывучэнні беларускай мовы і літаратуры. Гэта звязана са скарачэннем колькасці гадзін на вывучэнне роднай мовы. Мае назіранні паказваюць, што зменшылася і колькасць вучняў, якія выбіраюць беларускую мову ў якасці выпускнога экзамену. Выхоўваючыся ў рускамоўным асяроддзі, чуючы беларускую мову толькі з вуснаў настаўніка роднай мовы і літаратуры, вучань робіць высновы, што вывучэнне прадмета «Беларуская мова» не запатрабавана часам, а таму немэтазгодна.

Яшчэ ў XVII стагоддзі Я. М. Каменскі адзначаў: «Правільна вучыць моладзь – гэта не значыць убіваць у галовы сабраную з аўтараў сумесь слоў, выразаў, думак, а гэта значыць – раскрываць здольнасць разумець рэчы. Каб менавіта з гэтай здольнасці, быццам з жывой крыніцы, пацяклі ручайкі (веды)» [1, с. 58]. І гэта сапраўды так. Задача кожнага настаўніка – накіраваць вучня, навучыць знаходзіць і выбіраць і аналізаваць патрэбны матэрыял.

Навучанне беларускай мове ў IX класе і на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне асобы вучня як свядомага носьбіта мовы, развіццё яго інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Вучань асэнсоўвае мову як уласную, нацыянальную і агульначалавечую каштоўнасць і мае такі ўзровень падрыхтоўкі, які забяспечвае паўнацэннае выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах яе функцыянавання. Адной з задач навучання беларускай мове ў IX–XI класах з’яўляецца «сістэматызацыя і паглыбленне ведаў пра мову і маўлення, заканамернасці і правілы фукцыянавання моўных сродкаў у маўленні,

нормы беларускай літаратурнай мовы; авалоданне спосабамі дзейнасці, неабходнымі для асэнсавання законаў і фактаў мовым (моўная і лінгвістычная кампетэнцыі) [2, с. 97].

Практыка паказвае, што ў многіх навучэнцаў цяжкасці пры вывучэнні прадмета звязаны з няўменнем працаваць з вучэбнай інфармацыяй, аналізаваць яе, абагульняць, параўноўваць, запамінаць і прымяняць на практыцы. Назіраюцца выпадкі, калі школьнік знаходзіць у словах арфаграмы, але не валодае спецыфічным уменнем суадносіць арфаграмы з адпаведным правілам, у сувязі з чым дапускаецца памылка. Таму кожны настаўнік, які хоча дасягнуць высокіх паказчыкаў пры вывучэнні свайго прадмета, заўсёды павінен знаходзіцца ў стане творчага пошуку, каб зацікавіць вучняў. Вядома, гэта патрабуе ад сучаснага настаўніка пошуку новых метадаў, прыёмаў і формаў навучання.

Вопыт работы паказаў, што для падтрымкі і развіцця цікавасці да прадмета трэба пастаянна ствараць атмасферу навізны на ўроку, прычым не толькі праз змест матэрыялу, але і праз выкарыстанне разнастайных прыёмаў арганізацыі навучання на ўроку. Традыцыйныя формы работы не даюць належных вынікаў, бо работа на ўроку скіраваная ў асноўным на сярэдняга вучня, моцныя і слабыя застаюцца па-за межамі ўрока. У выніку, узровень ведаў слабых дзяцей апускаецца ўсё ніжэй і ніжэй, таленавітыя дзеці не развіваюцца, стрымліваюцца іх пазнавальныя здольнасці.

Працуючы ў старшых класах, я звярнула ўвагу на тое, што некаторыя вучні памылкова лічаць: вывучылі раздзелы курса беларускай мовы «Арфаэпія і арфаграфія», «Словаўтварэнне і арфаграфія», «Марфалогія і арфаграфія», «Сінтаксіс і пунктуацыя» на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі – і гэтага дастаткова не толькі для выніковай атэстацыі, але і для цэнтралізаванага тэсціравання. Любы экзамен – гэта заўсёды выпрабаванне, якому павінна папярэднічаць сур'ёзная, грунтоўная падрыхтоўка, якая пачынаецца загадзя, бо трэба не толькі паўтарыць правілы арфаграфіі, але і навучыцца прымяняць іх на практыцы.

Таму ўрокі, на якіх я выкарыстоўваю эфектыўныя метады і метады навучання, даюць магчымасць прымяняць калектыўныя спосабы дзейнасці, развіваць уменні і навыкі самастойнай работы. У атмасферы супрацоўніцтва і калектыўнай працы вучань становіцца партнёрам педагога па творчасці.

Вывучэнне правіл, якія складаюць змест навучання арфаграфіі, вучні пачынаюць з V класа.

Удасканаленне арфаграфічных навыкаў адбываеца ў IX–XI класах. Гэта прадугледжвае набыццё вопыту «імгненнага, аўтаматызаванага перанясення засвоеных правіл на любыя словы з дадзенымі арфаграмамі» [3, 319].

Пачатковым этапам у сістэме маёй дзейнасці з’яўляецца дыягнастычны, які дазваляе выявіць арфаграфічную граматнасць вучняў, спрыяе класіфікацыі тыповых памылак. Так як я пачынаю выкладаць курс вучэбнага прадмета «Беларуская мова» ў школе з V класа, то да IX класа маю магчымасць вывучыць вучэбныя дасягненні кожнага вучня. А дыягнастычныя даныя дапамагаюць вызначыць выкарыстанне найбольш эфектыўных метадаў і прыёмаў ў працэсе навучання як для асобнага навучэнца, так і для групы школьнікаў.

Асновай зместу маёй дзейнасці па ўдасканаленні арфаграфічнай граматнасці з’яўляюцца ўрокі, якія, на мой погляд, можна падзяліць на два віды: урокі, на якіх вывучаюцца асобныя правілы арфаграфіі (X клас), і ўрокі з элементамі вывучэння арфаграфіі (сувязь арфаграфіі з раздзеламі «Словаўтварэнне і арфаграфія», «Марфалогія і арфаграфія», «Сінтаксіс і пунктуацыя» (IX, X, XI класы)). Асобна можна выдзеліць кантрольна-тэставыя ўрокі.

На ўроках, дзе вывучаюцца канкрэтныя правілы арфаграфіі, я выкарыстоўваю наступныя метады: даследчы (фарміруе ўменне вучняў самастойна здабываць веды); блокавы (дазваляе паўтарыць і сістэматызаваць веды па правілах арфаграфіі); часткова-пошукавы (спрыяе таму, што шляхам лагічна ўзаемазвязаных пытанняў настаўніка і адказаў вучняў, ці пошукавай гутаркі, вырашаецца новая для вучняў праблема ці яе частка); праблемны.

На ўроках беларускай мовы выкарыстоўваю актыўныя метады навучання. Яны будуюцца на дыялогу, які прадугледжвае свабодны абмен думкамі пра шляхі вырашэння той ці іншай праблемы і характарызуецца высокім узроўнем актыўнасці вучняў.

Звернемся да практычнага вопыту. Хачу спыніцца на найбольш эфектыўных метадах і прыёмах навучання, якія дазваляюць вучням свядома і канструктыўна вырашаць як канкрэтныя вучэбна-пазнавальныя задачы, так і асэнсоўваць уласную дзейнасць, авалодваць рэфлексіўнымі механізмамі.

Задача арганізацыйна-матывацыйнага этапа – забяспечыць нармальную знешнюю абстаноўку для работы на ўроку, а таксама псіхалагічна падрыхтаваць вучняў да зносін. На гэтым этапе я часта чаргую індывідуальную работу з работай у парах. Даволі працяглы час выкарыстоўваючы працу ў парах, прыйшла да высновы, што пры дапамозе гэтага віду дзейнасці можна значна палепшыць работу не толькі на арганізацыйна-матывацыйным этапе, але і на іншых этапах урока. Дзеці станоўча ацэньваюць гэты від працы. Адзначаюць, што паступова з’яўляецца ўпэўненасць у сабе, адступае страх, нерашучасць, актывізуецца мысленне.

Дзейсным прыёмам на дадзеным этапе з’яўляецца акцыя «Рускай мове дай разгрузку – гавары па-беларуску». Так, вучням прапаную словы, напісаныя на рускай мове, і прашу перакласці іх на беларускую мову і скласці тэматычнае выказванне (словы падбіраюцца па тэме ўрока) (Дадатак 1).

Вельмі часта ў сваёй практыцы выкарыстоўваю і інтэрактыўныя метады, якія дапамагаюць настроіць вучняў на добрую працу на ўроку: «Крыжаванка», «Пажаданне», «Люстэрка», «Падары кветку».

На этапе актуалізацыі раней набытага вопыту вучняў адбываецца ўключэнне ўсіх школьнікаў у сумесную дзейнасць.

Прымяняю такі прыём, як «Лічбавыч дыктант», які дазваляе выявіць усё, што вучні ведаюць ці ўмеюць па вывучаемай тэме. Напрыклад, пры знаёмстве з правапісам слоў, заснаваных на арфаграфічным прынцыпе напісання, запісваю на дошцы сцвярджэнні і прашу выбраць тыя, што, на іх думку, з’уляюцца правільнымі, абгрунтаваўшы гэта (Дадатак 2).

Для актуалізацыі набытых раней ведаў па пэўнай тэме выкарыстоўваю прыём «Кошык ідэй, паняццяў і імёнаў», які дазваляе выявіць усё, што ведаюць і думаюць школьнікі па тэме заняткаў.

Так, пры вывучэнні тэмы «Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе» (правапіс суфікса -ск- у прыметніках) ў X класе на дошцы малююцца абрысы звычайнага кошыка, у які ў час эўрыстычнай гутаркі сцісла будзе ўпісана крэйдай усё тое, што ведаюць і скажуць вучні. Абмен інфармацыяй ажыццяўляецца з дапамогай індывідуальнай і групавой работы (Дадатак 3).

На аперацыйна-пазнавальным этапе арганізую вучэбную дзейнасць вучняў па ўзнаўленні раней вывучаных правіл па арфаграфіі і «адкрыцці» новых ведаў і іх засваенні. Асноўная мэта гэтага этапа – арганізаваць мэтанакіраваную пазнавальную дзейнасць вучняў па засваенні новых ведаў, стварыць сітуацыю ўзаемадзеяння.

Даволі часта на гэтым этапе выкарыстоўваю працу ў групах, якая дазваляе палепшыць работу на ўроку. Пры вывучэнні новага матэрыялу, працуючы ў групах, навучэнцы з задавальненнем складаюць табліцы, апорныя канспекты, планы, ставяць пытанні да матэрыялу параграфа, выконваюць практыкаванні (Дадатак 4).

Метадычныя прыёмы «Кластар» або «Кластар з белымі плямамі». Гэта графічная форма (схема) адлюстравання вывучаемага ці вывучанага матэрыялу, з дапамогай якой можна лёгка і эфектыўна паказаць сэнсавыя межы пэўнай інфармацыі. Са складаннем кластара, як паказвае мой педагагічны вопыт, вучні лёгка спраўляюцца. У цэнтры запісваецца галоўнае слова-паняцце; затым ад яго ў розныя бакі адыходзяць стрэлкі-прамяні

з фіксацыяй іншых тэрмінаў, ад якіх у сваю чаргу стрэлкі могуць адгаліноўвацца і далей. Выгляд элементаў кластара можа быць разнастайным: у форме кружкоў, квадрацікаў, ромбаў, зорак, кветак, шаблонаў, авалаў, абрысаў фігур (Дадатак 5).

Гэты прыём можна выкарыстаць таксама для арганізацыі індывідуальнай і групавой работы як у класе, так і дома.

Метад самастойнай працы выкарыстоўваю тады, калі ўпэўнена, што вучні змогуць самі разабрацца ў тэарытычным матэрыяле. Пры вывучэнні новай тэмы стаўлю задачу самастойна вывучыць новы матэрыял. Гэта прымушае вучняў разважаць над прачытаным.

Актыўна выкарыстоўваю і прыём «Пераблытаныя лагічныя ланцужкі».

Я падаю праграмны матэрыял са спецыяльнымі памылкамі. Вучні спачатку самастойна знаёмяцца з наглядным тэарэтычным матэрыялам і выказваюцца наконт яго правільнасці (Дадатак 6).

Арганізацыю пазнавальнай дзейнасці па засваенню новых ведаў, групавое ўзаемадзеянне на дадзеным этапе ажыццяўляю, выкарыстоўваючы метад «Дэфармаваны тэкст», які дазваляе знайсці ў тэксце арфаграмы, што не адпавядаюць беларускаму правапісу, выправіць памылкі і запісаць правільны варыянт (Дадатак 7).

Важным для арфаграфічнай граматнасці з’яўляецца, на маю думку, выкарыстанне на ўроках арфаграфічных ці слоўнікава-арфаграфічных хвілінак. Праводзіцца такая работа можа на любым этапе ўрока. У сваёй рабоце я выкарыстоўваю такія прыёмы: запіс слоў пад дыктоўку (на адпаведнае правіла), тлумачэнне выдзеленых літар у словах, паўторны запіс цяжкіх слоў, на якія раней акцэнтавалася ўвага, пад дыктоўку на дошцы і ў сшытках, практыкаванне тыпу дыктанта «Правяраю сябе», групоўка слоў па арфаграмах, аналіз памылак, якія дапушчаны ў работах, выпраўленне памылак у іншых вучняў, дыктанты з папярэднім разборам.

Арфаграфічныя хвілінкі прадугледжваюць развіццё ў вучняў умення разважаць над прымяненнем правілаў. Увага стварае аснову для арфаграфічнай граматнасці (Дадатак 8).

На карэкцыйна-рэфлексіўным этапе прапаноўваю навучэнцам скласці апорныя табліцы і схемы па тэме ўрока. Яны даюць магчымасць вывучаць матэрыял буйнымі блокамі, дапамагаюць паспяхова арганізоўваць паўтарэнне і абагульненне матэрыялу па раздзелах і тэмах (Дадатак 9).

Галоўная задача кантрольна-карэкцыйнага этапа ўрока – ўсталяваць усвядомленасць засваення новага матэрыялу, стымуляваць вучняў да самаадукацыі. На сваіх уроках я стараюся выкарыстоўваць метады кантролю і самакантролю ў навучанні. Плануемы вынік – выкананне кантрольныга задання, знаходжанне памылак і іх карэкцыя.

Кантрольна-тэставыя ўрокі – асноўная форма кантролю засваення вучнямі арфаграфічных навыкаў. Такія ўрокі дапамагаюць мне выявіць ступень засваення матэрыялу, даюць магчымасць убачыць тыповыя і індывідуальныя памылкі, прасачыць за дынамікай узроўню арфаграфічнай граматнасці. Найчасцей праводжу тэматычны кантроль (пасля вывучэння пэўнай тэмы), прамежкавы – пасля вывучэння асобнага раздзела; выніковы кантроль дазваляе абагуліць вывучаны курс пэўнага класа ў канцы навучальнага года. Вядучым відам кантролю з'яўляецца тэставы кантроль, бо ён дае магчымасць матываваць вучняў да здачы цэнтралізаванага тэсціравання па беларускай мове. Аналізуючы вынікі любога віду кантролю, я маю магчымасць праводзіць карэкцыйныя заняткі з вучнямі (Дадатак 10).

Грунтоўнасць засваення новай тэмы на ўроку, выяўленне таго, як умее мысліць вучань, можна праверыць з дапамогай прыёму «Тэма ў пытаннях». Навучэнцам даю магчымасць самастойна скласці пытанні па вывучанай тэме. Гэта дазваляе выявіць, наколькі глыбока засвоена тэма. Адразу бачу прабелы ў засваенні матэрыялу. Пры завяршэнні вывучэнні тэмы выкарыстоўваю прыём «Лінгвістычны дыктант» (Дадатак 11).

На ўласным вопыце я пераканалася, што калі надаць дастатковую ўвагу фарміраванню навыкаў, уменняў вучняў па ўдасканаленні арфаграфічнай граматнасці праз эфектыўныя метады і прыёмы навучання, то рана ці позна ў большасці вучняў узнікае жаданне вучыцца. Гэта, на мой погляд, можа адбыцца толькі тады, калі школьнік зразумее сэнс вывучаемага матэрыялу, навучыцца спазнаваць сябе ў навучальным працэсе.

***Літаратура***

1. Гайкевіч, А.П. На які вынік працаваць? / А.П. Гайкевіч // Беларуская мова і літаратура. – 2009. – № 6 – С. 57–58.
2. Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская мова». Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета «Беларуская мова» // Роднае слова. – 2009.- № 8. - С. 79 – 111.
3. Прыступа, Г.Н. Основы методики орфографии в средней школе / Г.Н. Приступа. – Рязань: Рязанский гос. пед. ин-т, 1973. – 319 с.
4. Ушинский, К.Д. Избранные педагогические сочинения / К.Д. Ушинский. – М.: Издательство АН РСФСР, 1945.

Дадатак 1

Фрагмент урока беларускай мовы ў IX класе

Тэма: Паняцце пра складаназлучаны сказ

Прыём – акцыя «Рускай мове дай разгрузку – гавары па-беларуску»: перакладзіце словы і словазлучэнні з рускай мовы на беларускую і складзіце тэматычнае выказванне па тэме ўрока.

Словы для перакладу: предложение, соединительная связь, равноправные части, средства связи, сочинительные союзы, сложное предложение, запятая, относительная самостоятельность, знаки препинания, две предикативные части.

Дадатак 2

Фрагмент урока беларускай мовы ў X класе

Тэма: Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапіс у, ў

Прыём «Лічбавыч дыктант»

Настаўнік: давайце ўспомнім матэрыял папярэдняга ўрока і выканаем лічбавы дыктант. Я зачытваю сцвярджэнні, а вы ставіце лічбу адзін, калі яно правільнае, нуль – калі памылковае.

1. Правапіс беларускай мовы грунтуецца на фанетычным, марфалагічным, традыцыйным і дыферэнцыраваным прынцыпах.
2. Да фанетычнага прынцыпу адносіцца перадача акання.
3. Правапіс зычных на стыку марфем.
4. Правапіс е, ё – я.
5. Напісанне літары **ц** на месцы спалучэнняў **т, ч, к, ц** і суфіксальнага **с** (у суфіксах **-ск-, -ств-**).
6. Правапіс шыпячых перад свісцячымі і свісцячых перад шыпячымі.
7. Правапіс **е** ў прыназоўніку **без** і часціцы **не**.
8. Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах.
9. Правапіс спалучэнняў **зн, нц, рц, рн, сн, сл.**
10. Правапіс звонкіх зычных на канцы слоў і перад глухімі.
11. Яканне.
12. Правапіс **у** і **ў** у залежнасці ад пазіцыі ў слове.
13. Напісанне прыставак і прыназоўнікаў на **-б, -д**, а таксама прыназоўнікаў на **-з**.
14. Правапіс прыстаўных гукаў.
15. Правапіс падоўжаных зычных.
16. Ужыванне вялікай і малой літары пры напісанні ўласных і агульных назоўнікаў: Цётка (паэтэса) і цётка (сваяцкія адносіны).

**Адказ: 1, 1, 0, 1, 1, 0, 0, 1, 1, 0, 1, 1, 0, 1, 1, 0.**

Дадатак 3

Фрагмент урока беларускай мовы ў X класе

Тэма: Напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе (правапіс суфікса **-ск-** у прыметніках)

Прыём «Кошык ідэй, паняццяў і імёнаў»

Мажлівыя адказы вучняў:

Суфікс **-ск-** у прыметніках пішацца, калі аснова назоўніка заканчваецца:

1. на **-д** (д + ск = дск), лідскі;
2. на **-с** (с + ск = ск), беларускі;
3. на **-т**, **-ц**, **-ч**, **-к** (т, ц, ч, к + ск = цк), ткацкі;
4. на **-нь** (назвы месяцаў і слова восень) (нь + ск = ньск), ліпеньскі;
5. на **-ж**, **-ш**, **-г**, **-х**, **-з** (геаграфічныя назвы, нацыянальнасць неславянскага паходжання) (ж, ш, г, х, з + ск = жск, шск, гск, хск, зск), французскі.

Дадатак 4

Фрагмент урока беларускай мовы ў X класе з выкарыстаннем групавой работы

Тэма: Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах

1 група

Перакладзіце словы на беларускую мову і запішыце іх пераклад:

Иерусалим, Иаков, Эфиопия, Альбион, Илиада, Циолковский, Индия, Кордильеры, шпион, триллион.

**Адказ: Іерусалім, Іякаў,Эфіопія, Альбіён, Іліяда, Цыялкоўскі, Індыя, Кардыльеры, шпіён,трыльён.**

2 група

Выпраўце памылкі ў словах:

Кліянтура, фіалка, нацыанальнасць, Неяпаль, віаланчэль, энтузіазм, шпіон, мемарыальны, файе, майонез.

**Адказ: кліентура, фіялка, нацыянальнасць, Неапаль, віяланчэль, энтузіязм, шпіён, мемарыяльны, фае, маянез.**

3 група

Гульня «Чацвертае лішняе»: неабходна знайсці чацвёртае лішняе слова ў кожным радзе, вусна растлумачыць выбар.

1. баст<u>ыё</u>н, п<u>ія</u>нер, патр<u>ыё</u>т, глад<u>ыё</u>лус;

2. р<u>аё</u>н, р<u>аё</u>нны, м<u>ая</u>нэз, М<u>аё</u>раў;

3. <u>іо</u>н, <u>Іо</u>сіф, <u>іо</u>нны, <u>іа</u>нізацыя;

4. канвеер, езуіт, фае, гігіена;

5. абрывіятура, Азія, акіян, варыянт.

**Адказ:**

1. бастыён, **піянер**, патрыёт, гладыёлус;

2. раён, раённы, **маянэз**, Маёраў;

3. іон, Іосіф, іонны, **іанізацыя**;

4. канвеер, езуіт, фае, **гігіена;**

5. абрывіятура, Азія, **акіян**, варыянт.

Дадатак 5

Фрагмент урока беларускай мовы ў X класе

Тэма: Утварэнне ступеней параўнання якасных прыметнікаў

Прыём «Кластар з белымі плямамі»




6

Фрагмент урока беларускай мовы ў X класе

Тэма: «Правапіс вялікай і малой літар»

Прыём «Пераблытаныя лагічныя ланцужкі»

| Было (1959 г.) | Закон Рэспублікі Беларусь № 420-З «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» | Стала (2008 г.) |
|---|---|---|
| вялікдзень | | Вялікдзень |
| Масленіца | | масленіца |
| Купалле | | купалле |
| чысты чацвер | | Чысты чацвер |
| Пакровы | | пакровы |
| курбан-байрам | | Курбан-байрам |

Дадатак 7

Фрагмент урока беларускай мовы ў IX класе

Тэма: Будова двухсастаўных складаных сказаў

Метад «Дэфармаваны тэкст»

Знайдзіце ў тэксце словы, дзе ёсць арфаграфічныя памылкі. Запішыце сказы правільна.

Я пайшоў на озеро. Яно вабіла да сябе, і ночу я часта сніў зялёныя вастравы ды сярэбраную месячную сцежку на ваддзе. Мгла засцілала наваколе нейкай казачнай прыгажосццю. Вунікальнае гэта слаунае мейсца.

Дадатак 8

Арфаграфічныя хвілінкі па беларускай мове

1. Запішыце словы, падкрэсліце шыпячыя адной рыскай, а свісцячыя – дзвюма.

Жыта, шыта, джала, чорны, зіма, снег, цень, рэзкі, просьба, касьба, дзядзька, возчык, рэзчык.

2. Слоўнікавая дыктоўка на правапіс падоўжаных зычных.

Таццяна, наваколле, адзенне, пяццю, павуцінне, карэнне, адценне, зіхаценне, асенні, вяселле, аддзячыць, Залессе, узвышша, развітанне, аблічча, апавяданне, каменны, дзённік, гадзіннік, бесперапынна, раздолле, мяккі, пяццюдзесяццю, раззбраенне.

3. Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя арфаграмы ў словах:

Старая ..ольха, не ўлавіць ..мгненне, ..узкаватая дарога, бела..усы дзед, цемны за..улак, прыехаць ў а..ўторак, ..облачнае неба, горная на..ука, па..мчалі па дарозе, старая ..львіца.

4. Акцэнталагічная хвілінка. Пастаўце ў словах націскі.

Нікуды, наруку, наглуха, накрыж, наспех, насмех, дачырвана, дасыта, сам-насам,загадзя,зацесна, зацемна, запар, як-небудзь, некуды.

5. Арфаграфічная хвілінка («Карэктар»). Выпраўце памылкі ў словах.

Медзіцына, маладосьць, здароў’е, здароўезберажэне, профілактыка, васем-наццатага, шчасце, лягенда, шніцэль, адажыо, дзме, сваеасаблівы.

Дадатак 9

Фрагмент урока беларускай мовы ў Х класе

Тэма: Правапіс галосных е, ё, я

Апорная табліца па тэме ўрока (складзеная вучнямі)

| Прававіс е | Правапіс ё | Правапіс я |
|---|---|---|
| у іншых складах перад націскам і пасля націску | у беларускай мове пішацца толькі пад націскам | у першым складзе перад націскам |
| у першым складзе перад націскам у словах іншамоўнага паходжання | | калі **я** ўваходзіць у склад кораня ці суфікса |
| у словах *васемсот, семсот* (Н. скл.) | | у даўно запазычаных словах з неславянскіх моў у першым складзе перад націскам на месцы е пішацца я |
| у словах не, без, калі яны пішуцца асобна | | у канчатках прымет-нікаў, парадкавых лічэбнікаў і займен-нікаў, а таксама назоў-нікаў жаночага роду творнага склону адз. ліку |
| ва ўласных назвах пасля г, к, х | | ва ўласных імёнах, імёнах па бацьку, проз-вішчах |

Дадатак 10

Фрагмент урока беларускай мовы ў Х класе

Тэма: Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапіс у, ў

Тэставая работа

Варыянт I

1). Адзначце правільна напісаныя словы:

1. авіятар 4. дыяпазон

2. дзіятэз 5. геніяльнасць

3. дыягназ 6. Спартакіада

2). Адзначце словы, у якіх дапушчаны памылкі:

1. рэакцыя; 4. спецыяльнасць;

2. фізіолаг; 5. біёлаг;

3. перыядыка; 6. меліярацыя.

3). Адзначце канструкцыі, дзе дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1. ад родных ніў, ад роднай хаты;

2. беларуска-украінскі слоўнік;

3. у «Звяздзе» урачыстасць;

4. продаж тавараў на аукцыёне.

4). Адзначце словы, дзе прапушчана літара **ў**:

1. Салтыко… Шчадрын;

2. Юрый Рытхэ… ;

3. Уладзімір За…ялаў;

4. Франц Га…с;

5. Мірасла… Мірона….

5). Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара:

1. па…уцінне; 4 …учора;

2. …удзіць; 5. …узор;

3. трох…угольнік.

Дадатак 11

Фрагмент урока беларускай мовы ў Х класе

Тэма: Правапіс **і**, **ы**, **й** пасля прыставак. Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны

Прыём «Лінгвістычны дыктант»

1. Пасля прыставак, якія канчаюцца на зычны гук, на месцы і пішацца..(ы);

2. Пасля прыставак між-, звыш-, суб-, контр-,су-, пан-, транс-, а таксама ў некаторых складаных словах пішацца літара… (і);

3. Пасля прыставак, якія канчаюцца на галосны, на месцы і пішацца…(й);

4. Гукавое спалучэнне зычнага гука [й] з галоснымі ў словах іншамоўнага паходжання перадаецца ётаванымі галоснымі, як і ў словах уласнабеларускіх на пачатку слова …(ё);

5. Прыстаўкі ад-, над-, пад-, перад-, аб- пішуцца заўсёды ...(нязменна);

6. Прыстаўкі з-, раз-, уз-, без- пішуцца перад … зычнымі (звонкімі);

7. Прыстаўкі с-, рас-, ус-, бес- пішуцца перад … зычнымі(глухімі).